# БЕЛАРУСЬ

Канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання, але на практыцы ўлады абмяжоўвалі гэтае права.

За справаздачны перыяд узровень забеспячэння свабоды веравызнання знізіўся. Урад ствараў перашкоды для замежных місіянераў, святарства і гуманітарных работнікаў, звязаных з цэрквамі: дэпартаваў, адмаўляў у візах і ануляваў выдадзеныя візы. Рэакцыя ўрада на шматлікія антысеміцкія дзеянні і захады супраць рэлігійных помнікаў, будынкаў і могілак была малазаўважнай. Улады вымушалі многія рэлігійныя суполкі чакаць на працягу некалькіх гадоў рашэнняў, што тычыліся рэстытуцыі ці рэгістрацыі ўласнасці. Урад працягваў абмяжоўваць свабоду веравызнання ў адпаведнасці з палажэннямі прынятага ў 2002 годзе рэлігійнага закона аб веравызнанні і падпісанага ў 2003 годзе пагаднення з Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ), што ёсць часткай Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ) і адзінай афіцыйна прызнанай у краіне праваслаўнай царквой. Нягледзячы на тое, што ў краіне няма дзяржаўнай рэлігіі, пагадненне надае БПЦ прывілеяваны статус. Улады таксама праследавалі і штрафавалі сяброў некаторых рэлігійных груп, асабліва тых, што, як падаецца, расцэньваюцца ўладамі як праваднікі іншаземнага культурнага ўплыву або як палітычна заангажаваныя. Адмоўнае стаўленне да пратэстантаў было асабліва выразным, магчыма з-за таго, что іх асацыююць са Злучанымі Штатамі.

Некаторыя прадстаўнікі грамадства канструктыўна працавалі на карысць свабоды веравызнання, але былі выпадкі дыскрымінацыі і перасledу з боку грамадства, напрыклад, шматлікія акты вандалізму і падпалы культавых месцаў, будынкаў і помнікаў.

Урад Злучаных Штатаў Амерыкі ўздымае пытанні свабоды веравызнання ў размовах з урадам Беларусі ў межах сваёй агульнай палітыкі, скіраванай на абарону правоў чалавека, але афіцыйныя асобы неаднаразова адхілялі прапановы прадстаўнікоў урада ЗША сустрэцца, каб абмеркаваць крокі, што ўспрымаюцца як парушэнні.

Частка 1. Рэлігійная дэмаграфія

Тэрыторыя краіны -- 80154 квадратныя мілі, насельніцтва – 9705000 чалавек. Гісторыя склалася так, што краіна была і ёсць арэнай як узаемадзення, так і супрацьстаяння паміж беларускім праваслаўем і рыма-каталіцызмам. Цягам справаздачнага перыяду адносіны між гэтымі канфесіямі палепшыліся. Паводле дадзеных на студзень 2007 года, што паступілі з Апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН), каля 50 адсоткаў беларусаў лічаць сябе вернікамі. Паводле афіцыйных дадзеных, сярод усіх людзей, што спавядаюць рэлігіі, прыкладна 80 адсоткаў належыць да БПЦ, 14 адсоткаў прылічаюць сябе да рымска-каталіцкай царквы, 4 адсоткі адносяць сябе да ўсходніх рэлігійных груп (у тым ліку крышнаітаў, мусульман, бахаяў), а пратэстанты, у тым ліку адвентысты сёмага дня, стараверы, Сведкі Іеговы, хрысціяне веры апостальскай і лютэране складаюць 2 адсоткі. З тых, хто вызначае сябе як праваслаўны ці рыма-католік, толькі 18 і 50 адсоткаў адпаведна рэгулярна наведваюць набажэнствы. Ёсць таксама вызнаўцы грэка-каталіцкай царквы і праваслаўных суполак, што не належаць да БПЦ. Паводле яўрэйскіх суполак, ад 50 да 70 тысяч чалавек вызначаюць сябе як яўрэяў. Пераважная бальшыня прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва актыўна не вызнае рэлігію. Лічыцца, што сярод тых яўрэяў, якія ёсць актыўнымі вернікамі, бальшыня належыць да рэфармісцкіх, прагрэсіўных ці кансерватыўных іудзеяў. Існуюць таксама невялікія, але актыўныя суполкі “Хабад-Любавіч”.

Паводле дадзеных АУСРН, на 1 студзеня 2007 года існавала 3103 рэлігійных арганізацый 25 рэлігійных канфесій і дэнамінацый, у тым ліку 2953 зарэгістраваных рэлігійных супольнасцяў, 150 рэспубліканскіх і канфесійных аб'яднанняў (кляштараў, таварystваў, місіянераў і г.д.). Сюды ўваходзяць 1399 прыходаў Беларускай праваслаўнай царквы, 493 прыходаў евангельскіх хрысціян, 440 рымска-каталіцкіх, 267 прыходаў евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 74 прыходы адвентыстаў сёмага дня, 54 прыходы хрысціян Поўнага Евангелля, 33 стараверскіх, 29 іудзейскіх, 27 лютэранскіх, 26 прыходаў Сведкаў Іеговы, 24 мусульманскіх, 21 прыход нова-апостальскай царквы, 17 прыходаў прагрэсіўных іудзеяў, 13 грэка-каталіцкіх, 9 прыходаў хрысціян веры апостальскай, 6 крышнаіцкіх і 5 бахайскіх, 5 прыходаў царквы Хрыста, 4 мармонскіх, 2 месіянскіх, 1 прыход рэфармісцкай царквы, 1 прыход прэсвітэран, 1 армянскі апостальскі, адзін лацінска-каталіцкі і адзін прыход Іаганскай царквы.

Замежныя святары і місіянеры рабілі спробы працаваць у краіне, але іх дэпартавалі, адмаўлялі ў візе ці скасоўвалі выдадзеныя ім візы.

Частка 2. Становішча са свабодай веравызнання

Прававыя і палітычныя ўмовы

Свабода веравызнання абвешчана Канстытуцыяй, але на практыцы дзяржава абмяжоўвала гэтае права. Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя, прынятая з папраўкамі ў 1996 годзе, яшчэ раз пацвердзіла роўнасць усіх рэлігій і дэнамінацый перад законам, яна ўтрымлівае агаворку пра тое, што адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулююцца з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Урэгуляваннем усіх рэлігійных пытанняў займаецца АУСРН.

Насуперак пратэстам праваабарончых арганізацый, Еўрапейскага Саюза і мясцовых рэлігійных груп у 2002 годзе прэзідэнт Лукашэнка сваім подпісам увёў у дзеянне закон аб рэлігіі. Закон сцвярджае "вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа", а таксама гістарычнае значэнне каталіцызму, іудаізму, ісламу і евангелічна-лютэранскай царквы – груп, што прытрымліваюцца так званых "традыцыйных вераванняў". Аднак паняцце "традыцыйныя вераванні", што ўзгадваецца ў законе, не распаўсюджанае на рэлігійныя групы з глыбокімі гістарычнымі каранямі ў краіне, напрыклад, беспапоўскія стараверскія і кальвіністкія суполкі, што з'явіліся ў краіне ўжо ў 17 стагоддзі.

Нягледзячы на тое, што закон дэкларуе свабоду веравызнання, ён утрымлівае шэраг абмежавальных палажэнняў, што павышаюць узровень кантролю ўрада над дзейнасцю рэлігійных груп. Закон патрабуе, каб усе рэлігійныя групы атрымлівалі дазвол урада на ўвоз і распаўсюд рэлігійнай літаратуры, забараняе замежнікам узначальваць рэлігійныя арганізацыі і пазбаўляе суполкі магчымасці ствараць навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі ўласных святароў. У дадатак, закон абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных суполак тымі раёнамі, дзе яны зарэгістраваныя, і ўводзіць складаныя рэгістрацыйныя патрабаванні, якія цяжка выканаць многім як традыцыйным, так і нетрадыцыйным рэлігійным арганізацыям. Закон запатрабаваў таксама, каб усе зарэгістраваныя раней рэлігійныя групы прайшлі да 2004 года перарэгістрацыю, і забараніў любую рэлігійную дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп.

Рэлігійныя арганізацыі краіны працягвалі заклікаць да адмены па меншай меры часткі прынятага ў 2002 годзе закона. Хрысціянскія суполкі заяўлялі, што закон жорстка абмяжоўвае іх дзейнасць і свабоду веравызнання, стварае юрыдычныя падставы для крымінальнага пераследу асобаў за рэлігійныя перакананні.

Закон аб рэлігіі вызначае трохузроўневую структуру рэлігійных арганізацый. Рэлігійныя суполкі ці мясцовыя рэлігійныя арганізацыі-адзінкі павінны налічваць не менш як дваццаць сябраў ва ўзросце не маладзей за 18 гадоў, што жывуць у дадзенай мясцовасці. Рэлігійныя аб'яднанні павінны мець не менш як 10 суполак, прычым адна з іх павінна дзейнічаць у краіне па меншай меры 20 гадоў, і могуць быць заснаваныя толькі рэспубліканскімі рэлігійнымі аб'яднаннямі (на агульнанацыянальным узроўні).

Рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі актыўныя рэлігійныя суполкі ёсць у бальшыні з 6 абласцей рэспублікі. Усе заяўкі на заснаванне рэлігійных аб'яднанняў і рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў падаюцца ў АУСРН. За перыяд, што асвятляецца гэтай справаздачай, урад зарэгістраваў пяць рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў.

Рэлігійныя аб'яднанні павінны падаць спіс сябраў свайго кіруючага органа з біяграфічнымі звесткамі, дакумент, што пацвярджае права аб'яднання на размяшчэнне ў пэўным месцы, і пратаколы ўстаноўчага сходу аб'яднання. Аб'яднанні валодаюць выключным правам ствараць духоўныя навучальныя ўстановы, запрашаць замежных грамадзян для працы з рэлігійнымі групамі і ствараць кляштары і манаскія суполкі.

Суполка мусіць прадставіць спіс заснавальнікаў з указаннем іх імёнаў, месцаў жыхарства, грамадзянства і асабістымі подпісамі, экзэмпляры статута, пратаколы ўстаноўчага з'езда і дазвол абласных уладаў займаць ці карыстацца маёмасцю, што ўзгадваецца ва ўстаноўчых дакументах. Заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (для суполак за межамі Мінска) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Суполка, якая вызнае рэлігію, што раней не была "вядомая" ўраду, павінна таксама падаць інфармацыю пра сваю рэлігію. За справаздачны перыяд ніводную рэлігійную суполку, што не была раней "вядомая", не зарэгістравалі.

Пагадненне, заключанае ў 2003 годзе паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць у яе ўнутраных справах і свабоду ў правядзенні рэлігійных абрадаў і іншай дзейнасці, а таксама асаблівыя адносіны з дзяржавай. Пагадненне прызнае за ролю БПЦ "у фармаванні духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа". Пагадненне заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні сваёй палітыкі ў розных сферах, у тым ліку ў сферах адукацыі, развіцця і аховы культурнай спадчыны, а таксама ў вобласці бяспекі. Хоць у дакуменце і сцвярджаецца, што пагадненне не абмяжоўвае рэлігійныя свабоды іншых канфесій, у той самы час яно заклікае ўрад і БПЦ змагацца супраць неназваных "псеўдарэлігійных структур, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства". У дадатак, БПЦ валодае эксклюзіўным правам выкарыстоўваць слова "праваслаўны" ў сваёй назве, а таксама выкарыстоўваць у якасці свайго сімвала выяву крыжа Ефрасінні, святой-апякункі краіны. Нягледзячы на шэраг падпісаных за апошнія некалькі гадоў палажэнняў аб супрацоўніцтве паміж БПЦ і рознымі ўрадавымі ўстановамі, роля БПЦ у дзейнасці дзяржаўных арганізацый, паводле наяўных звестак, была мінімальнай.

8 студзеня 2007 года прэзідэнт Лукашэнка ўганараваў некалькіх прадстаўнікоў БПЦ прэміяй “За духоўнае адраджэнне” за іх намаганні развіваць “традыцыі мастацтва і маралі, што робяць свой унёсак ва ўсталяванне духоўных каштоўнасцяў сярод людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнянняў”. 21 снежня 2006 года на сустрэчы з сінодам БПЦ прэзідэнт Лукашэнка высока ацаніў супрацоўніцтва паміж урадам і БПЦ і падкрэсліў агульнасць мэтаў – грамадскай згоды і нацыянальнага адзінства. Прэзідэнт таксама адзначыў, што ўрад падтрымлівае БПЦ: у 2006 годзе на праекты БПЦ урад выдзеліў 3 мільёны даляраў (6,4 мільярдаў рублёў).

Абмежаванні свабоды веравызнання

Улады абмяжоўвалі свабоду веравызнання як непасрэдна, так і ўскосна. Урад прымяняў законы, што абмяжоўваюць свабоду набажэнства, слова і сходаў. Часам урад быў адказны за дзеянні, звязаныя з рэлігійнай нячуласцю і нецярпімасцю, і рэгулярна не выступаў з асуджэннем такіх дзеянняў. Урад усё часцей ствараў перашкоды для замежных місіянераў, клерыкаў і гуманітарных работнікаў, у тым ліку дэпартаваў іх, адмаўляў ім у візах і ануляваў выдадзеныя візы. Некаторыя рэлігійныя групы, афіцыйна зарэгістраваныя і незарэгістраваныя, сутыкнуліся са складанасцямі ў пытаннях арэнды і набыцця нерухомай маёмасці для абсталявання памяшканняў для набажэнства, пабудовы цэркваў ці вяртання сабе царкоўнай уласнасці, што знаходдзіцца пад кантролем дзяржавы.

Паводле звестак Форума-18, БПЦ і прадстаўнікі ўрада вымушалі прыхажанаў незарэгістраванай Рускай праваслаўнай царквы за мяжой (РПБЗ), якая аддзялілася ад БПЦ у 1927 годзе, адазваць свае імёны з заявы РПБЗ, што была пададзеная на рэгістрацыю. Калі б нават адзін з 20 падпісантаў заявы адазваў сваё імя, РПБЗ павінна была б распачаць працэдуру з самага пачатку. Паводле РПБЗ, з жніўня да кастрычніка 2006 года двое святароў Маскоўскага патрыярхата пагражалі прыхажанам адмовай у сакрамэнце, калі яны і надалей будуць падтрымліваць “незаконную і некананічную секту”. Паводле РПБЗ, імёны прыхажан святары атрымалі ад мясцовых уладаў.

14 верасня 2006 года пастар Сяргей Гейль, старшыня незарэгістраванай Самастойнай евангелічна-лютэранскай царквы ў Рэспубліцы Беларусі, паведаміў, што ўрад адмовіўся зарэгістраваць яе як рэспубліканскае аб’яднанне. Ад кастрычніка 2004 года царква робіць спробы зарэгістравацца як аб’яднанне, і правяла чатыры ўстаноўчыя сходы ў Бабруйску ў адпаведнасці з патрабаваннямі да працэдуры рэгістрацыі. Паводле АУСРН, рэгістрацыйныя дакументы ўтрымлівалі “тэхнічныя памылкі”.

Многія традыцыйныя і нетрадыцыйныя рэлігійныя групы па-ранейшаму сутыкаліся з праблемамі пры набыцці ці рэгістрацыі ўласнасці, асабліва калі яны спрабавалі перааформіць нерухомасць з жылога фонду для яе выкарыстання як культавай маёмасці. Паводле ўрада, закон дазваляе выкарыстоўваць маёмасць для набажэнстваў толькі пасля яе выключэння з жылога фонду. Жыллёвы кодэкс прадугледжвае выкарыстанне жылой маёмасці для іншых мэтаў з дазволу мясцовых выканаўчых і адміністратыўных органаў. У выніку шэраг пратэстанцкіх цэркваў і “нетрадыцыйныя” групы апынуліся ў замкнёным коле: ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй уласнасці з жылога фонду для выкарыстання яе ў рэлігійных мэтах таму, што яны не з’яўляюцца зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі, і яны не могуць прайсці рэгістрацыю, не маючы афіцыйнага адраса. Такія групы часта вымушаны былі сустракацца нелегальна або ў дамах сваіх прыхажан.

22 сакавіка 2007 года Вышэйшы гаспадарчы суд прыпыніў на няпэўны тэрмін разгляд справы царквы “Новае жыццё”, што ў Мінску. Царква “Новае жыццё” сутыкнулася з пагрозай закрыцця, таму што ўлады адмовіліся рэгістраваць прыход у кароўніку, які знаходзіўся ва ўласнасці царквы і які яна імкнулася выкарыстоўваць як памяшканне для набажэнстваў. У выніку любая дзейнасць царквы лічылася нелегальнай. У знак пратэсту супраць загаду Мінскага гарадскога гаспадарчага суда ад 10 ліпеня 2006 года прадаць царкоўны будынак гораду за суму, значна ніжэйшую за яго рынкавы кошт, і вызваліць памяшканне да 8 кастрычніка 2006 года, прыхажане царквы “Новае жыццё” і тыя, хто ім спачувае, пачалі 23-дзённую галадоўку, якая прымусіла ўлады перагледзець сваё рашэнне. Па стане на канец справаздачнага перыяду разгляд справы не быў завершаны. 21 кастрычніка 2006 года каля 700 прыхажан і прыхільнікаў царквы “Новае жыццё” прынялі ўдзел у санкцыянаванай уладамі Мінска акцыі пратэсту на плошчы Бангалор супраць загаду прадаць будынак.

6 снежня 2006 года ўлады Гродна дазволілі рымска-каталіцкай суполцы Найсвяцейшай Панны Марыі, Маці Міласэрнасці пабудаваць касцёл для сваёй 8-тысячнай парафіі, якая сустракалася для набажэнстваў у невялікім драўляным доме, што можа змясціць да 300 чалавек. 1 снежня 2006 года 12 парафіянаў распачалі галадоўку і працягвалі яе да таго часу, пакуль улады не далі дазвол на будаўніцтва. Першую заяву на гэты дазвол парафія падала ў 1998 годзе.

4 снежня 2006 года пасля інспекцыі санітарнай службы і ўстановы, адказнай за прадухіленне надзвычайных сітуацый, Мінскую суполку Свядомасці Крышны (Харэ Крышна) вымусілі пакінуць свой офіс, што месціўся на станцыі тэхнічнага абслугоўвання. Іншым арандатарам інспектары дазволілі застацца. Мінская і Бабруйская суполкі Харэ Крышна шукаюць юрыдычны адрас ад таго часу, як ім адмовілі ў рэгістрацыі ў 2004 годзе. Яны зрабілі спробу зарэгістравацца на станцыі тэхнічнага абслугоўвання, але ў лістападзе 2006 года ўлады ім у гэтым адмовілі.

15 ліпеня 2006 года Вярхоўны суд адхіліў скаргу пастара Георгія Вязоўскага на закрыццё баптысцкай рэфармісцкай царквы “Запавет Хрыста”. Мінскі гарадскі суд закрыў царкву ў траўні 2006 года з-за таго, што яна зрабіла спробу зарэгістравацца ў жылым будынку, што ёсць парушэннем палажэння закона, якое абавязвае ўсе рэлігійныя групы рэгістравацца па “юрыдычным” адрасе.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў. Адміністрацыі некаторых грамадскіх аб’ектаў, спасылаючыся на гэтую пастанову, скасавалі ці адмовіліся падоўжыць дамовы з рэлігійнымі групамі на выкарыстанне сваіх аб’ектаў. На працягу справаздачнага перыяду рэлігійным групам, асабліва незарэгістраваным, па-ранейшаму было складана арэндаваць грамадскае памяшканне. Найбольш ад гэтай пастановы цярпелі пратэстанцкія суполкі, таму што ў іх менш уласных памяшканняў, і ім даводзіцца арэндаваць грамадскія памяшканні, калі колькасць сяброў занадта вялікая, каб сутракацца ў прыватных дамах.

25 чэрвеня 2007 года адміністрацыя Цэнтральнага раёна Мінска паведаміла царкве “Ян Прадвеснік”, што ў яе не будзе магчымасці арэндаваць памяшканне ў дзяржаўным РДК прафсаюзаў нібыта з-за цяжкасцяў з састаўленнем расклада.

Ад лютага 2006 года да канца справаздачнага перыяду харызматычная царква “Жывое слова” ў Гродна зрабіла не менш як сем спробаў арэндаваць памяшканне для сходаў і кожны раз атрымлівала адмову ад дзяржаўных устаноў.

28 снежня 2006 года дзяржаўны ідэолаг Алег Бобрык без тлумачэнняў умяшаўся ў ход семінара па сямейных адносінах, што праводзіў пратэстанцкі прапаведнік у палацы культуры Валожына. У той жа дзень адміністрацыя Валожына звольніла 15 супрацоўнікаў палаца культуры. Паводле Сяргея Яску, пастара царквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў “Вефіль”, праз звальненні прадстаўнікі ўрада імкнуліся выкараніць усялякае ўзаемадзеянне паміж евангельскімі хрысціянамі і дзяржаўнымі ўстановамі.

На працягу справаздачнага перыяду ўрад абмяжоўваў мірныя сходы, звязаныя з рэлігійнай дзейнасцю. 4 чэрвеня 2007 года Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт адмовіў незарэгістраванай партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя” ў правядзенні 8 чэрвеня на Плошчы Свабоды акцыі пратэсту супраць падаўлення ўладамі свабоды сумлення. У красавіку 2007 года ўлады падобным чынам не дазволілі БХД правесці акцыю ў падтрымку свабоды веравызнання.

Паступалі вартыя даверу звесткі пра тое, што мясцовыя ўлады і школьныя настаўнікі спрабавалі вызначыць, хто з дзяцей наведвае баптысцкую нядзельную школу. Паводле “Форума-18”, баптысцкі пастар Генадзь Бруцкі паведаміў, што тым дзецям, чыё наведванне баптысцкай нядзельнай школы было ўстаноўлена, пагражаў завуч. Таксама па словах пастара Яску, дзяржаўны ідэолаг Бобрык запатрабаваў, каб настаўнікі высветлілі, ці наведваюць іх вучні пратэстанцкую нядзельную школу. Калі дзеці наведваюць такую школу, настаўнікі мелі “правесці размову” з іх бацькамі.

На працягу перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай, урад сачыў за дзейнасцю суполак мірных рэлігійных меншасцяў, асабліва тых, што ўрад успрымае як “іншаземныя” або як “культы”. Паводле вартых даверу звестак, прадстаўнікі службаў дзяржаўнай бяспекі часта наведвалі пратэстанцкія набажэнствы, каб весці назіранне.

Атрыманню дазволу на наведванне краіны замежнымі рэлігійнымі дзеячамі часта папярэднічалі працяглыя бюракратычныя працэдуры. Закон патрабуе, каб замежныя місіянеры і клерыкі атрымлівалі гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам займацца “рэлігійнай дзейнасцю”. Арганізацыя, што запрашае прадстаўніка кліру з-за мяжы, павінна падаць пісьмовую заяву ў АУСРН з пазначэннем тэрміну і мэты візіта. Нават калі візіт мае не рэлігійныя мэты, а дабрачынныя, наведвальнікі павінны атрымаць візу і дазвол АУСРН. АУСРН дае адказ у тэрмін да 20 дзён. Не існуе механізму, які дазваляў бы абскардзіць яго рашэнне.

Назіральнікі выказвалі занепакоенасць у сувязі з тым, што адсутнасць адзінай сістэмы ўрадавых патрабаванняў да выканання змененых у лютым 2006 года візавых працэдур уплывае на магчымасці для місіянераў жыць і працаваць у краіне. Улады часта распытвалі замежных місіянераў і гуманітарных работнікоў, а таксама мясцовых грамадзян, што працуюць з імі, пра крыніцы і выкарыстанне іх фінансавых сродкаў. Паступалі вартыя даверу звесткі пра тое, што службы бяспекі сачылі і вялі назіранне за гэтымі замежнымі грамадзянамі.

Паводле “Форума-18”, у верасні 2006 года ўлады дазволілі грамадзяніну Ізраіля равіну Боруху Ламдану застацца ў краіне, але не далі дазволу на выкананне рэлігійнай працы нібыта

за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Равін Ламдан не пагадзіўся з абвінавачаннямі і сцвердзіў, што адмова тлумачыцца яго спазненнем заплаціць падаткі з дабрачыннай фінансавай дапамогі, што паступіла на яго імя. Ламдан пакінуў краіну ў чэрвені 2007 года пасля таго, як урад не выдаў яму новую рэлігійную візу.

У ліпені 2006 года ўлады не далі дазволу незарэгістраванаму Аб'яднанню хрысціянаў Поўнага Евангелля запрасіць нігерыйскага пастара Ансельма Мабудуку для прапаведавання ў "Новым пакаленні" - трох цэрквах-сябрах аб'яднання. Паводле ўладаў, у царквы "няма падставаў" яго запрашаць, таму што яна незарэгістраваная, і візіт Мабудукі немэтазгодны, улічваючы тое, што "Новае пакаленне" нібыта "парушае беларускі закон".

Урад не дазваляе замежным місіянерам прымаць удзел у рэлігійнай дзейнасці па-за межамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Перамяшчэнне паміж рэлігійнымі арганізацыямі, у тым ліку прыходамі, патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ад дзяржавы. Напрыклад, 13 кастрычніка 2006 года ўлады аштрафавалі грамадзяніна Польшчы, рымска-каталіцкага святара Антонія Качка на 29 даляраў (62 000 рублёў) за правядзенне "несанкцыянаванай" імшы ў Мінску, таму што ён быў замацаваны за касцёлам у Слуцку.

Органы ўнутраных справаў могуць вымушаць замежных святароў паехаць з краіны, адмовіўшы ім у рэгістрацыі або не выдаўшы дазвол на часовае знаходжанне. Улады могуць дзейнічаць самастойна або на падставе рэкамендацый іншых урадавых установаў.

Вясной 2007 года быў вымушаны пакінуць краіну заснавальнік і пастар царквы "Новы запавет" ў Мінску, пастар яе месіянскай яўрэйскай суполкі, амерыканскі грамадзян, які працаваў у краіне на працягу 10 гадоў. Вясной 2006 года ўлады адмовіліся падоўжыць яго дазвол на працу.

У кастрычніку 2006 года ў Гродна ўлады адмовіліся выдаць новыя візы дванаццаці польскім рымска-каталіцкім манахіням і святарам, што працавалі ў краіне на працягу больш як 10 гадоў. Паводле ўладаў, мясцовым выпускнікам рымска-каталіцкіх семінарый патрэбны працоўныя месцы. Нягледзячы на галадоўкі, петыцыі і пратэсты з боку рымска-каталіцкай супольнасці, святарам і манахіням загадалі пакінуць краіну да 31 снежня 2006 года. Закон забараняе "падрыўную дзейнасць" замежных арганізацый і накладае забарону на адкрыццё прадстаўніцтваў замежных арганізацый, дзейнасць якіх узбуджае "нацыянальную, рэлігійную і расавую варожасць" або можа "аказаць негатыўны ўплыў на фізічнае і духоўнае здароўе людзей". 30 траўня 2007 года ўлады аштрафавалі грамадзяніна Польшчы Яраслава Лукасіка, неафіцыйнага пастара царквы "Ян Прадвеснік", на 15 даляраў (31 000 рублёў) за правядзенне несанкцыянаванага набажэнства 27 траўня дома ў іншага пастара. Адначасова ён атрымаў пастанову аб сваёй дэпартацыі за "неаднаразовае парушэнне парадку знаходжання ў краіне замежных грамадзян", забарону на ўезд на працягу 5 гадоў і загад пакінуць краіну да 7 чэрвеня. Лукасік не пагадзіўся з абвінавачаннямі, сцвердзіўшы, што наведваў, а не праводзіў набажэнства 27 траўня. 8 траўня 2007 года ўлады скасавалі від на жыхарства Лукасіка з прычыны яго меркаванага датычэння да "дзеянняў, скіраваных супраць нацыянальнай бяспекі". Лукасік абскардзіў штраф і пастанову аб дэпартацыі ў мясцовым судзе, але суд не задаволіў яго патрабаванняў 20 і 27 чэрвеня адпаведна. Жонка і трое дзяцей Лукасіка – грамадзяне Беларусі. Незалежныя СМІ паведамлялі, што яго сям'я звярталася ў суд вышэйшай інстанцыі, аднак паперы, што маюць адносіны да справы, "згубіліся" і не былі знойдзеныя да таго часу, пакуль не скончыўся тэрмін, па працягу якога можна абскарджаваць рашэнне суда.

Замежных грамадзян, што знаходзяцца ў краіне з нерэлігійнымі мэтамі, могуць папярэдзіць ці дэпартаваць у выпадку іх ўдзелу ў рэлігійнай дзейнасці.

21 чэрвеня 2007 года ў Магілёве на падставе таго, што дакументы ўтрымлівалі тэхнічныя памылкі, суддзя адмяніла рашэнне аб санкцыях супраць сямі амерыканцаў і адправіла справу на новы разгляд. 16 лютага 2007 года ўрад дэпартаваў гэтых семярых амерыканцаў і забараніў ім уезд у краіну на два гады за незаконную выкладчыцкую і незаконную рэлігійную дзейнасць. 13 лютага міліцыя абвінаваціла групу ў парушэнні, прадугледжаным артыкулам 185 адміністратыўнага кодэксу "Парушэнне парадку знаходжання замежных грамадзян у Беларусі" і аштрафавала кожнага на 15 даляраў (32 000 рублёў) за дзеянні, несумяшчальныя з умовамі атрыманых імі віз. Паводле ўрада, гэтыя сямёра павінны былі атрымаць дазвол міністэрства адукацыі, каб выкладаць ангельскую мову ў малітоўным доме ў Магілёве. Абвінавачанні былі высунутыя пасля наведвання міліцыяй будынку царквы. На зыходзе тэрміну, ахопленага гэтай справаздачай, вынікі паўторнага разгляду яшчэ не былі вядомыя.

14 сакавіка 2007 года ўлады скасавалі від на жыхарства і дэпартавалі амерыканца-пратэстанта, што займаўся прадастаўленнем гуманітарнай дапамогі. Паводле ўладаў, ён меў дачынэнне да дзеянняў, "скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы". Улады не далі патлумачылі, у чым палягала меркаваная пагроза. Гэты чалавек займаўся дабрачыннай дзейнасцю і наведваў пратэстанцкую царкву ў Мінску.

Прадстаўнік саюза баптыстаў Генадзь Бруцкі паведаміў, што ўлады дапрасілі грамадзяніна ЗША, у якога была гуманітарная віза, пасля таго як ён выступіў з прамовай на выпускной цырымоніі ў Біблейскім каледжы ў траўні 2006 года. У сакавіку 2007 года ўлады адмовілі яму ў новай візе, і ён быў вымушаны пакінуць краіну.

Закон не забараняе грамадзянам прапаведаваць і адкрыта казаць пра свае рэлігійныя перакананні, але на практыцы ўлады часта ўмешваліся ў іх дзейнасць, а таксама каралі некаторых грамадзян, што прапаведавалі ад імя як зарэгістраваных, так і незарэгістраваных рэлігійных суполак. Улады рэгулявалі ўсе аспекты прапаведавання і распаўсюду літаратуры.

Улады па-ранейшаму праследавалі і штрафавалі сябраў суполкі Харэ Крышна за незаконы распаўсюд рэлігійнай літаратуры. У студзені 2007 года ўлады канфіскавалі ў сябры суполкі Харэ Крышна 14 кніг і аштрафавалі яго на 15 доларaў (32 000 рублёў) за незаконны распаўсюд рэлігійных матэрыялаў.

12 чэрвеня 2007 года міліцыя зняла расцяжку, на якой было напісана "Я маю права на веру" з маста ў цэнтры Мінска праз паўтары гадзіны пасля таго, як яе туды павесілі актывісты апазіцыі. Расцяжка памеру 9 на 18 футаў змяшчала выяву анёла, што вызваляецца ад ланцугоў.

Урад па-ранейшаму выкарыстоўваў падручнікі, што спрыяюць рэлігійнай нецярпімасці, асабліва ў адносінах да "нетрадыцыйных" вераванняў. Лідэры пратэстанцкай супольнасці крытыкавалі як прадузятыя ў адносінах да пратэстантаў фармулёўкі падручніка "Асновы бяспекі жыццядзейнасці", у прыватнасці, раздзел пад назвай "Беражыцеся сект".

Раздзел змяшчае параграф, які расказвае вучням пра такія “секты” як адвентысты сёмага дня, царква Марыі, Белае брацтва і Сведкі Іеговы. Міністэрства адукацыі, не зважаючы на пратэсты рэлігійных груп, па-ранейшаму выкарыстоўвала падручнік “Чалавек, грамадства, дзяржава”, у якім суполкі пратэстантаў і Харэ Крышна называюцца “сектамі”. Улады абацалі змяніць фармулёўкі ў новых выданнях гэтых кніг. Ніводная з іх не была перавыдадзеная да канца перыяду, ахопленага гэтай справаздачай.

Урад часта называе “нетрадыцыйнымі” ўсе рэлігійныя суполкі, што не ўспрымае як традыцыйныя, прычым службовыя асобы і дзяржаўныя СМІ ў дачыненні да апошніх шырока выкарыстоўваюць тэрмін “секта”, хаця ён і не з’яўляецца афіцыйным. На працягу справаздачнага перыяду ўрад рабіў захады, каб “папярэдзіць” грамадскасць пра “новыя” суполкі” і прадухіліць іх распаўсюд.

15 чэрвеня 2007 года дзяржаўная газета “Рэспубліка” надрукавала артыкул пад назвай “Новыя крыжакі”, у якім сучасную місіянерскую дзейнасць каталікоў параўноўвалі з крыжовымі паходамі, а ролю Папы Яна Паўла II ў падзенні камунізма апісвалі як “д’ябальскія авантуры” і даводзілі пра ягонае меркаванае супрацоўніцтва з ЦРУ. Польская супольнасць краіны выступіла з пратэстам супраць атрыкула і заклікала да ўзбуджэння крымінальнай справы супраць яго аўтара і рэдактара газеты. Пазней “Рэспубліка” папрасіла прабачэння за публікацыю.

21 траўня 2007 года Сяргей Хоміч,  старэйшы пастар царквы “Міласэрнасць” атрымаў ліст ад падкантрольнага дзяржаве тэлеканала “Лад”, у якім аўтары не прызнавалі за сабой ніякай віны за эфір 12 траўня, калі вядучы назваў суполку царквы “Міласэрнасць” таталітарнай і дэструктыўнай сектай. Адначасова з паказам кадраў набажэнства і канферэнцыі суполкі “Міласэрнасць”, вядучы Арцём Махакееў абвінаваціў лекараў у вылужванні грошай у хворых і папярэдзіў, што заможныя  людзі “часта становяцца аб’ектам увагі сект”.

12 снежня 2006 года “Рэспубліка” заклікала ўлады быць надзвычай асцярожнымі з “новымі” рэлігіямі, таму што яны могуць весці да трагедыі і ёсць пагрозай грамадству. Аўтар сцвярджаў, што новыя рэлігіі, у тым ліку саенталогія, Кабала, і будызм ёсць сінкрэтычнымі і не навучаюць сваіх прыхільнікаў “чаму-кольвек добраму”.

8 снежня 2006 года ўрад паведаміў царкве “Новае жыццё”, што не будзе распачынаць справу супраць падкантрольнага дзяржаве Сталічнага тэлебачання (СТВ). 14 і 15 кастрычніка 2006 года СТВ дапусціла паклёпніцкія сцверджанні пра незарэгістраваную пратэстанцкую групу ў рэпартажы з назвай “Дзіўныя вызнаўцы не менш дзіўнай рэлігіі”. Калі СТВ адмовілася зрабіць абвяржэнне, царква “Новае жыццё” звярнулася да ўладаў з просьбай распачаць крымінальную справу супраць СТВ і прымусіць тэлеканал зрабіць абвяржэнне. Урад адмовіўся нібыта на падставе таго, што ў дзеяннях тэлеканала “няма прыкметаў злачынства”.

Хаця БПЦ аддаецца перавага, з боку ўрада таксама гучалі перасцярогі аб “празмерным уплыве” БПЦ. Прэзідэнт Лукашэнка сустрэўся з сінодам БПЦ 21 снежня 2006 года, каб растлумачыць свой “прагматычны” падыход да БПЦ пасля скаргаў царквы на артыкул у дзяржаўнай газеце, напісаны чыноўнікам адміністрацыі прэзідэнта, у якім ён перасцерагаў грамадзян ад уплыву БПЦ і заявіў, што яна аслабляе ўздзеянне дзяржаўнай ідэалогіі.

Паступалі вартыя даверу сведчанні пра ўмяшальніцтва ўрада ў рэлігійныя вандроўкі. Паводле Хрысціянскага праваабарончага дома, што працуе ў Беларусі, 3 студзеня 2007 года на беларуска-польскай мяжы ўлады спынілі прыкладна на пяць гадзін і абшукалі аўтобус, у якім знаходзіліся каля 40 маладых каталікоў і пратэстантаў. Група вярталася ў Беларусь пасля пілігрымкі ў Харватыю.

9 жніўня 2006 года памежнікі затрымалі нібыта за парушэнні норм санітарыі і бяспекі і перавезлі ў Мінск 47 дарослых і дзяцей-баптыстаў, што наладзілі рэлігійны лагер на тэрыторыі прыватнай гаспадаркі на захадзе Гродненскай вобласці. Напярэдадні мясцовыя ўлады загадалі групе раз’ехацца і пагражалі забраць дзяцей у міліцэйскую ўстанову для малалетніх правапарушальнікаў і пакінутых дзяцей. Пасля таго як іх адпусцілі, высокапастаўлены прадстаўнік установы, адказнай за справы рэлігіі, публічна прызнаў, што лагер быў законны, таму што быў арганізаваны прыватнымі асобамі. Паводле “Форума-18”, розныя ўрадавыя дэпартаменты праводзілі да чатырох праверак у дзень у баптысцкім моладзевым летнім лагеры ў Брэсцкай вобласці.

На працягу справаздачнага перыяду на абмежаваным узроўні адбывалася рэстытуцыя культавай уласнасці. Для рэстытуцыі ўласнасці, канфіскаванай падчас савецкай і нацысцкай акупацый, не існуе заканадаўчай базы. Закон таксама абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца ў культурных і асветніцкіх мэтах. Урад не вяртаў будынкі, калі не меў месца для перасялення тых, што іх займае. Напрыклад, у мінулым прыходзілі адмовы на бальшыню просьбаў яўрэйскай супольнасці вярнуць сінагогі, што выкарыстоўваюцца ў якасці тэатраў, музеяў, спартовых комплексаў і піўной. Аднак на працягу справаздачнага перыяду яўрэйскія суполкі не падавалі заяваў на вяртанне будынкаў ці іншай нерухомай маёмасці.

28 лістапада 2006 года мясцовыя ўлады ў Валожыне пагражалі адабраць у яўрэйскай суполкі правы на вернуты ёй будынак ешывы з-за таго, што не адбывалася яго аднаўленне. Яўрэйская суполка пачала аднаўленне ешывы, калі яе вярнулі ў 90-я гады, але для завяршэння рэстаўрацыі не хапіла фінансавання. Нарэшце ўлады не сталі канфіскоўваць 200-гадовы будынак пасля таго, як камітэт, што месціцца ў Злучаных Штатаў, паабяцаў у траўні 2007 года сабраць грошы на рэстаўрацыю.

Напрыканцы справаздачнага перыяду ў Мінску каталіцкая суполка святога Юзэфа працягнула кампанію зваротаў да ўрада з просьбай вярнуць былы касцёл бернардынаў і будынкі кляштара, што цяпер утрымліваюць дзяржаўныя архівы і што ўлады плануць ператварыць у гасцініцу і забаўляльны цэнтр. Суполка рэгулярна праводзіць блізу касцёла набажэнствы з таго часу, як упершыню даведалася пра планы рэканструкцыі ў 2004 годзе, але ў сакавіку 2007 года ўрад абвясціў пра новыя планы перабудовы, пасля чаго суполка пачала збор подпісаў пад петыцыяй. Па стане на 4 чэрвеня 2007 года было сабрана больш як 10 000 подпісаў. Раней старшыня АУСРН казаў, што ўрад не можа вярнуць касцёл і кляштар, таму што ўрад не мае грошай для будаўніцтва новага памяшкання для архіваў. 7 чэрвеня ўлады не дазволілі суполцы сабрацца на набажэнства, абвясціўшы, што для сходу патрэбны дазвол, але нікога з вернікаў не затрымалі. 16 чэрвеня блізу 90 чалавек сабраліся каля касцёла і запалілі свечкі пад наглядам міліцыі.

Замахі на свабоду веравызнання

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, урад па-ранейшаму рыбіў захады супраць свабоды веравызнання шэрагу рэлігійных груп. Як і раней, найчасцей рэлігійных лідэраў вінавацілі ў арганізацыі ці правядзенні несанкцыянаванага сходу, парушэнні, прадугледжаным законам, што абмяжоўвае свабоду сходаў.

Закон дазваляе грамадзянам збірацца ў прыватных дамах, але ён абмяжоўвае правядзенне ў такіх месцах рытуалаў, абрадаў ці цырымоній і патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ад мясцовых уладаў. На працягу справаздачнага перыяду пратэстанты і іншыя суполкі, што не належаць да БПЦ, атрымлівалі папярэджанні ці штрафы за правядзенне незаконных набажэнстваў, незаконную рэлігійную дзейнасць ці незаконные сходы без папярэдняга атрымання дазволу ўрада.

26 чэрвеня 2007 года суд Цэнтральнага раёна Мінска на задаволіў скаргу Антонія Бокуна, пастара зарэгістраванай царквы "Ян Прадвеснік", на неналежнае абыходжанне з ім з боку міліцыі падчас яго арышту, што адбыўся ў тым жа месяцы. 4 чэрвеня 2007 года суддзя аднаго з раённых судоў Мінска пастанавіла арыштаваць Бокуна на тры дні за арганізацыю 3 чэрвеня несанкцыянаванага набажэнства ў сябе дома. У той дзень 10 афіцыйных асобаў прыйшлі да яго дадому падчас набажэнства і даставілі яго і пастара Яраслава Лукасіка ў пастарунак. Міліцыя вызваліла Лукасіка праз некалькі гадзін, а Бокуна трымалі да раніцы, нягледзячы на тое, што ў яго сардэчна-сасудзістае захворванне. Яму стала кепска, спатрэбілася медыцынская дапамога.

27 чэрвеня і 20 чэрвеня адпаведна Мінскі гарадскі суд не задаволіў скаргаў Бокуна на арышт і налажэнне штрафа. 28 траўня суд прызнаў Бокуна вінаватым у правядзенні незаконнага набажэнства і аштрафаваў яго на 290 долараў (620 000 рублёў). Міліцыя арыштавала Бокуна 27 траўня, калі ўвайшла ў яго дом і запісала набажэнства на відэа.

8 траўня 2007 года міліцыя затрымала і папярэдзіла моладзевага актывіста Яна Шутка аб тым, што яго ўдзел у кампаніі па прадухіленні перабудовы рымска-каталіцкага кляштара ў Мінску ў гасцініцу і казіно можа выклікаць "вялікія праблемы".

11 сакавіка 2007 года ўлады афіцыйна папярэдзілі Сяргея Несцяровіча з незарэгістраванага Братэрства Божага Пераўвасаблення за рэгулярнае правядзенне нелегальных рэлігійных сходаў у сваёй кватэры і збор сродкаў. У сакавіку прадстаўнікі КДБ увайшлі ў кватэру Несцяровіча падчас набажэнства і на працягу трох гадзін праводзіліператрус, канфіскоўвалі літаратуру, дапытвалі і фатаграфавалі прысутных. Несцяровіч падаў скаргу, каб зняць папярэджанне, але ўлады не яе задаволілі.

У снежні 2006 года ў Крупках улады пісьмова папярэдзілі Мікалая Барычэўскага (царква "Міласэрнасць Езуса") за парушэнне правілаў прапіскі. Ён не звярнуў увагі на папярэджанне і застаўся ў Крупках. Калі Барычэўскі спытаў, чым папярэджанне было выкліканае, афіцыйныя асобы паведамілі, што ўвагу да яго асобы прыцягнулі яго неаднаразовыя крытычныя заўвагі на адрас рэжыма.

30 жніўня 2006 года Сяргея Пазняковіча, пастара царквы саюза хрысціян веры евангельскай "Выратаванне", аштрафавалі на 2 170 долараў (4,65 мільёны рублёў) за правядзенне абраду хрышчэння на возеры. У ліпені 2006 года Мікалая Куркаева, пастара царквы "Выратаванне" саюза хрысціян веры евангельскай, аштрафавалі на 75 долараў (160 000 рублёў) за правядзенне несанкцыянаванага набажэнства.

28 ліпеня 2006 года ўлады аштрафавалі пастара царквы “Новае жыццё” Вячаслава Ганчарэнку на 470 доляраў (1 мільён рублёў) за правядзенне ў тым жа месяцы несанкцыянаванага набажэнства.

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, паступілі звесткі пра не менш як 13 выпадкаў, калі ўрад накладаў штрафы ў памеры ад 13 да 2 600 доляраў (ад 26 000 да 5,3 мільёнаў рублёў) за незаконную рэлігійную дзейнасць.

Прымусовы зварот у веру

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі б выкрадзеныя або незаконна вывезеныя са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

Антысемітызм

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, вырасла колькасць асобных праяўленняў антысемітызму. Дзяржава цярпліва ставіцца да антысемітызму. Расследванне вялося па фактах толькі некаторых антысеміцкіх захадаў, і ўрад не перашкаджаў дзяржаўным прадпрыемствам друкаваць і распаўсюджваць антысеміцкія матэрыялы.

Некалькі яўрэйскіх культавых месцаў пацярпелі ад вандалізму цягам справаздачнага перыяду.

28 чэрвеня 2007 года лідэры мясцовых яўрэйскіх арганізацый паведамілі, што на тым тыдні на яўрэйскіх могілках у Магілёве былі паваленыя чатыры надмагіллі. Сваякі пахаваных у тых магілах людзей звярнуліся ў міліцыю, адзін з прадстаўнікоў якой выступіў з версіяй, што цяжкія надмагіллі перакуліў штармавы вецер, хаця ў меркаваны час інцыдэнта штармавога ветру не было.

9 траўня 2006 года вандалы падпалілі кветкі, ускладзеныя да помніка ахвярам Брэсцкага яўрэйскага гета. Міліцыя распачала крымінальную справу, але не вызначыла падазраваных. Гэты быў восьмы акт вандалізму супраць гэтага помніка з часу яго ўсталявання ў 1992 годзе і трэці з пачатку перыяду, ахопленага гэтай справаздачай. У лютым 2007 года вандалы апаганілі помнік. Падазраваныя вызначаныя не былі. 29 лістапада 2006 года на месцы таго самага помніка адбыўся выбух, які нанёс помніку невялікае пашкоджанне. Яўрэйская супольнасць выступіла з пратэстам супраць адмовы ўладаў распачаць крымінальную справу и правесці расследванне інцыдэнта, які адбыўся ў лістападзе і які міліцыя кваліфікавала як дробнае хуліганства. Паводле слоў лідэра мясцовай яўрэйскай суполкі, напрыканцы справаздачнага перыяду міліцыя яшчэ вяла даследванне інцыдэнта, што адбыўся ў лютым.

4 траўня 2007 года ў Брэсце на апоры маста вандалы намалявалі зорку Давіда, што вісіць на шыбеніцы. Надпіс выдалілі хутка пасля таго, як ён быў нанесены, і мясцовая яўрэйская суполка не падавала заяву ў міліцыю.

1 сакавіка 2007 года незалежныя СМІ паведамілі, што вандалы знялі частку металічнай мемарыяльнай шыльды з помніка забітым у Мінскім гета яўрэям Брэмена. Помнік знаходзіцца на месцы старых яўрэйскіх могілак. Таксама ў пачатку сакавіка 2007 года з

фасада жылога будынку ў цэнтры Мінска знікла бронзавая шыльда, прысвечаная памяці забітых яўрэяў Брэмена. Шыльду нібыта знайшоў чалавек, пра асобу якога нічога не стала вядома, і вярнуў яўрэйскай суполцы пасля абвяшчэння нямецкім амбасадарам узнагароды ў памеры 1 350 долараў (2,9 мільёны рублёў) за вяртанне шыльды. Напрыканцы лютага 2007 года вандалы пашкодзілі зорку Давіда ў Курапатах на шыльдзе, прысвечанай памяці яўрэйскіх ахвяраў сталінскіх рэпрэсій.

3 траўня 2007 года ў Барысаве міліцыя распачала крымінальную справу ў сувязі з выпадкам вандалізму на яўрэйскіх могілках. Напрыканцы красавіка вандалы знялі і пашкодзілі 16 надмагілляў. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, справа яшчэ вялася. Падазраваных не вызначылі.

Напрыканцы лютага 2007 года адбыўся напад неанацыстаў на Ларысу Шукайла, кіраўніка Магілёўскага аддзялення Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсій. Двое маладых людзей кінулі ў Шукайла бутэльку і крыкнулі “З’язджай у свой Ізваіль!” Шукайла звярнулася са скаргай да ўладаў, але па стане на канец справаздаснага перыяду падазраваныя вызначаныя не былі.

12 лістапада 2006 года ў цэнтры Мінска вандалы запэцкалі белай фарбай і намалявалі свастыкі на помніку ахвярам Халакосту “Яма”. Нягледзячы на тое, што побач былі знойдзеныя неа-нацысцкія антысеміцкія ўлёткі за подпісам “Фронта арыйскага супраціву “Белая Русь”, улады не звярнулі на інцыдэнт ўвагі, палічыўшы яго выпадкам падлеткавага хуліганства. У той жа дзень на будынку Ізраільскага інфармацыйнага цэнтра з’явіўся надпіс “Бей жыдоў!”. Пры асвятленні захадаў вандалаў падкантрольнае дзяржаве СТВ назвала яўрэйскую культуру “чужынскай для Беларусі”. Нягледзячы на тое, что афіцыйныя асобы абяцалі пакараць вінаватых, 16 сакавіка 2007 года крымінальныя справы закрылі за адсутнасцю падазраваных.

У пачатку кастрычніка 2006 года ў Воршы, горадзе на поўначы краіны, вандалы, чые асобы засталіся нявызначанымі, пашкодзілі бетонны плот-агарожду яўрэйскіх могілак і разбурылі 10 надмагілляў. 17 надмагілляў былі пашкоджаныя на хрысціянскіх могілках. Міліцыя адмовілася ад ўзбуджэння крымінальнай справы, палічыўшы гэтыя дзеянні дробнымі адміністратыўнымі правапарушэннямі.

У верасні 2006 года на старых яўрэйскіх могілках у Свержані, што на ўсходзе краіны, вандалы пашкодзілі 5 магілаў. Міліцыя распачала расследванне, але па стане на канец справаздачнага перыяду падазраваныя вызначаныя не былі.

Яўрэйская супольнасць па-ранейшаму выказвала занепакоенасць выкарыстаннем панятку “больш шчыльнага славянскага саюза”, які карыстаецца папулярнасцю сярод нацыяналістычных арганізацый, што дзейнічаюць у краіне, у тым ліку ў Рускага нацыянальнага адзінства (РНА), якое існавала, нягледзячы на тое, што было афіцыйна распушчанае ў 2000 годзе.

На працягу ўсяго справаздачнага перыяду лідэры яўрэйскай супольнасці звярталіся да ўладаў з хадайніцтвамі аб расследванні захадаў неанацыстаў, у тым ліку рэгулярныя выпадкі вандалізму, нанясення антысеміцкіх надпісаў, пагрозаў на адрас грамадзянскай супольнасці і рэгілійных груп. Улады адказвалі спагадлівымі лістамі, але не распачыналі крымінальных спраў у сувязі з гэтымі скаргамі.

10 жніўня 2006 года незалежная газета "Віцебскі кур'ер" атрымала ліст ад неанацысцкай групоўкі РНА, якая пагражала газете закрыццём, калі яна працягне публікаваць артыкулы, што дыскрэдытуюць беларускага прэзідэнта і яго палітыку, скіраваную на тое, каб "славянскія нацыі былі вышэйшымі за яўрэяў". Бланк утрымліваў лозунг "Ачысцім Расію!" і выяву салдата, які трымае задушанага чалавека з зоркай Давіда на грудзях і доларамі ў кішэні. Праваахоўныя органы не расследвалі гэтую пагрозу на падставе таго, што РНА не зарэгістраваная ў рэгіёне, і таму немагчыма высветліць, хто з'яўляецца аўтарам ліста.

Працягваўся продаж і распаўсюд антысеміцкай літаратуры праз дзяржаўных распаўсюднікаў прэсы, урадавыя ўстановы і крамы, звязаныя з БПЦ. На працягу справаздачнага перыяду праз "Праваслаўную кнігу", што прадае праваслаўную літаратуру і рэлігійную атрыбутыку, па-ранейшаму прадавалі антысеміцкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратура, DVD і відэакасеты. "Праваслаўная кніга" -- частка фірмы "Праваслаўная ініцыятыва", чый генеральны дырэктар часта піша ксенафобскія артыкулы. Насуперак выдадзенаму ў 2003 годзе загаду генеральнага пракурора і міністэрства інфармацыі аб выдаленні з продажу экзэмпляраў антысеміцкай і ксенафобскай газеты "Русский вестник", крама па-ранейшаму яе распаўсюджавала. У "Праваслаўнай кнізе" можна было набыць кнігу "Бесы на Русі . Глабалізм як спараджэнне зла" Валерыя Зелянеўскага, навуковага супрацоўніка Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь (НАН РБ). Гэта кніга, выдазеная ў Мінску напрыканцы 2006 года, змяшчае шматлікія антысеміцкія сцверджанні кшталту "яўрэі па-ранейшаму спавядаюць рабаўладальніцкія погляды". З прычыны таго што падкантрольная дзяржаве НАН РБ дала дазвол на публікацыю кнігі, лідэры яўрэйскай супольнасці і праваабаронцы палічылі кнігу адлюстраваннем пэўных бакоў ідэалогіі рэжыму.

У адрозненне ад папярэдніх справаздачных перыядаў, на працягу апошняга дзяржаўныя выданні не рабілі захадаў супраць іудзейскіх суполак.

На афіцыйным сайце БПЦ Гаўрыіл Беластоцкі, малалетняе дзіцё, нібыта забітае яўрэямі каля Гродна ў 1690 годзе, узгадваецца як святы пакутнік. Памінальная малітва, што чытаецца ва ўгодкі яго смерці, узгадвае "мужнага пакутніка" Гаўрыіла, які "выкрыў нячэснасць яўрэяў".

Паляпшэнне сітуацыі ў сферы захавання свабоды веравызнання

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, былі зробленыя некаторыя станоўчыя крокі ў сферы захавання свабоды веравызнання.

Улады далі каталіцкай парафіі святога Яна Хрысціцеля дазвол на будаўніцтва касцёла ў Мінску і прадаставілі парафіі для будаўніцтва надзел зямлі. Будаўніцтва пачалося 15 чэрвеня 2007 года. З часу рэвалюцыі 1917 года гэта першы выпадак будаўніцтва касцёла ў Мінску.

У 2007 годзе ўлады вярнулі будынак у Гродна праваслаўнаму Святапакроўскаму сабору.

У жніўні 2006 года ў Воршы актывісты грамадзянскай супольнасці здолелі выратаваць рэшткі царквы 18-га стагоддзя. Актывісты дасылалі лісты і хадайніцтвы прадстаўнікам мясцовага ўрада, пратэстуючы супраць будаўніцтва на яе месцы ізалятара часовага ўтрымання. У пачатку жніўня будаўніцтва прыпынілі, а 31 жніўня афіцыйныя асобы пагадзіліся змяніць праект, каб у выніку будаўніцтва не быў пашкоджаны падмурак царквы.

20 ліпеня 2006 года пасля разгляду скаргі выхавацельніцы дзіцячага садка Людмілы Ізаксон-Балатоўскай, пракуратура адмяніла папярэджанне, вынесенае выхавацельніцы за "незаконнае і наўмыснае навязванне рэлігійнай догмы маленькім дзецям". Афіцынае папярэджанне Ізаксон-Балатоўскай улады вынеслі ў красавіку 2006 года, пасля таго як на мясцовым тэлебачанні прайшоў рэпартаж пра тое, як яе дзіцячы яўрэйскі музычны калектыў адзначае іудзейскае свята ў дзяржаўным дзіцячым садку. Паводле ўладаў, яна парушыла закон праз правядзенне рэгілійнага святкавання ў дзяржаўным будынку і незаконна прапаведавала іудаізм. Паводле Ізаксон-Балатоўскай, гэта была культурніцкая імпрэза, праведзеная не з рэгілійнымі, а з адукацыйнымі мэтамі. Улады прысумілі Ізаксон-Балатоўскую выдаліць з класнага пакоя "яўрэйскую сімволіку" і пагражалі крымінальным пераследам, калі яна будзе працягваць сваю дзейнасць. У верасні 2006 год група здолела сабрацца зноў, каб працягваць вывучэнне яўрэйскай гісторыі і традыцый.

5 ліпеня 2006 года прэзідэнт Лукашэнка падпісаў указ аб вяртанні рымска-каталіцкай царкве Мінскага касцёла Святой Троіцы (касцёла святога Роха) і маёмасці, што ў ім знаходзіцца. На працягу папярэдніх пятнаццаці гадоў Беларуская дзяржаўная філармонія выкарыстоўвала касцёл як канцэртную залю.

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, адбылося адкрыццё некалькіх рэлігійных помнікаў. Фінансаванне бальшыні помнікаў было прыватным, але прадстаўнікі мясцовых урадаў прымалі ўдзел у бальшыні цырымоній адкрыцця.

## Частка 3. Знявага і дыскрымінацыя ў грамадстве

Некаторыя прадстаўнікі грамадства імкнуліся садзейнічаць свабодзе веравызнання, аднак у грамадстве былі адзначаныя выпадкі знявагі і дыскрымінацыі па рэлігійных перакананнях, па-ранейшаму прысутнічалі антысемітызм і негатыўнае стаўленне да рэлігійных суполак, што ў меншасці.

Як і ў папярэднія гады, невядомыя вандалы разбуралі і праваслаўныя, і неправаслаўныя крыжы, пастаўленыя ў Курапатах, урочышчы, дзе Народны камісарыят ўнутраных спраў (НКУС) у 30-ыя гады XX-га стагоддзя растраляў больш як 300 тысяч чалавек. У красавіку 2007 года вандалы пашкодзілі мемарыял у Курапатах, прысвечаны ахвярам сталінскіх рэпрэсій, перакуліўшы і зламаўшы шэсць крыжоў. Па стане на канец справаздачнага перыяду расследавання ў рамках крымінальнай справы не праводзілася.

30 траўня 2007 года нявызначаныя рабаўнікі ўзламалі праваслаўную царкву святога Георгія ў Вардомічах і скралі пяць абразоў. Гэта быў толькі апошні з шэрагу нераскрытых рабаванняў цэркваў, у выніку якіх з трох розных цэркваў у гэтым годзе былі скрадзеныя 16 абразоў. Міліцыя не паведамляла пра якія-кольвек поспехі ў расследваннях гэтых злачынстваў, якія прыпісала добра арганізаванай злачыннай групоўцы.

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, адбылося некалькі падпалаў. 27 сакавіка 2007 года вандалы падпалілі рымска-каталіцкі касцёл святога Міхала ў Мазыры і пакінулі на вонкавых паверхнях сцен надпісы сатанінскага зместу. За 10 дзён да таго вандалы разбілі ў касцёле скульптуру, крыжы і вакно. 28 сакавіка міліцыя арыштавала чатырох сябраў сатанінскай групоўкі Квывавы месяц. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, расследванне працягвалася, і затрыманыя знаходзіліся пад вартай.

25 снежня 2006 года вандалы падпалілі праваслаўную царкву святога Георгія ў Мазыры. Агонь поўнасцю знішчыў дах і ўнутраныя сцены. На тыя вонкавыя сцены, што засталіся, былі нанесеныя сатанінскія надпісы. Гэта быў другі за шэсць тыдняў выпадак падпалу царквы. 13 лістапада вандалы пакінулі сатанінскія надпісы на вонкавай паверхні сцен і падпалілі царкву. Чацвёра сябраў сатанінскай групоўкі Квывавы месяц, якіх затрымалі за вандалізм у адносінах да рымска-каталіцкага касцёла святога Міхала ў Мазыры, прызналіся ў падпале царквы святога Георгія. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, затрыманыя знаходзіліся пад вартай, і расследванне працягвалася.

13 ліпеня 2006 года ў Фарным касцёле Гродна (касцёле святога Францішка Ксаверыя) адбыўся падазроны пажар. Вогнішча знішчыла частку галоўнага алтара і чатыры скульптуры 18-га стагоддзя. Міліцыя распачала крымінальную справу, але па стане на канец справаздачнага перыяду якой-кольвек дадатковай інфармацыі не з'явілася.

На працягу справаздачнага перыяду былі пашкоджаныя некалькі могілак і месцаў пахавання. 27 красавіка міліцыя абвінаваціла мужчыну ў пашкоджанні гістарычнага помніка, пасля таго як 10 і 16 сакавіка ў Заслаўі адбыліся выпадкі вандалізму на пяці пахавальных курганах 10-га і 11-га стагоддзяў. Па стане на канец справаздачнага перыяду якой-кольвек дадатковай інфармацыі не з'явілася.

13 лютага 2007 года за адсутнасцю падазраваных міліцыя прыпыніла крымінальную справу па факце пашкоджання 15 студзеня мусульманскіх могілак у Слоніме, дзе месцяцца магілы расійскіх жаўнераў-мусульман, забітых падчас Першай сусветнай вайны. Вандалы перакулілі 6 надмагілляў і знішчылі 2. Гэты быў трэці з 1996 года напад на могілкі.

Незалежныя СМІ паведамілі, што ноччу 20 лістапада 2006 года нявызначаныя вандалы напісалі "Не верце сектам!" у Баранавічах на знаку, які накіроўвае да царквы "Выратаванне", што належыць да беларускага Саюза хрысціян веры евангельскай. Паводле меркавання прадстаўнікоў улады і СМІ, вандаламі маглі быць п'яныя падлеткі. Паводле царквы, гэты захад быў арганізаваны.

17 лістапада 2006 года царква "Новае жыццё" паведаміла, што міліцыя адмовілася распачынаць крымінальную справу ў сувязі з апаганьваннем царквы ноччу 31 кастрычніка 2006 года. Існуе меркаванне, што плямы чорнай фарбы і надпіс чырвонай фарбай "Не – таталітарным сектам!", а таксама партыйная сімволіка  былі нанесеныя на сцены будынка сябрамі нацыянал-бальшавіцкай партыі, расейскай экстрэмісцкай групоўкі.

На працягу справаздачнага перыяду некаторыя асобы і недзяржаўныя  арганізацыі  дзейнічалі канструктыўна, імкнуліся павысіць ўзровень узаемнай павагі і цярпімасці сярод прыхільнікаў розных рэлігій, выступалі за забеспячэнне свабоды веравызнання.

18 чэрвеня 2007 года ў Мінску генеральныя сакратары Еўрапейскіх канферэнцый каталіцкіх біскупаў завяршылі чатырохдзённы форум. У сучаснай гісторыі краіны гэты быў першы форум сакратароў, праведзены ў Мінску. Яны абмяркоўвалі пытанні міграцыі, экуменізму, пастаральнай працы, адносінаў з мусульманскімі суполкамі, а таксама пытанні, з якімі сутыкаюцца рымска-каталіцкія парафіі краіны, у тым ліку складанасці, звязаныя з будаўніцтвам новых касцёлаў. 15 чэрвеня ў сактарароў адбылася паспяховая сустрэча з экзархам БПЦ Мітрапалітам Філарэтам.

28 траўня 2007 года экзарх БПЦ Мітрапаліт Філарэт выказаў падтрымку грамадскаму камітэту па ўшанаванні памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій.

У лютым 2007 года рома і баптысцкія суполкі разам працавалі над тым, каб рома бясплатна атрымалі Святое Пісанне на сваёй мове.

19 красавіка 2007 года няўрадавая арганізацыя "Хрысціянскі праваабарончы дом" разам з Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй выпусціла "Маніторынг парушэнняў правоў хрысціян у Беларусі", у якім пералічваюцца захады супраць хрысціян, што адбыліся ў 2006 годзе. "Хрысціянскі праваабарончы дом" быў створаны летам 2006 года з мэтай адсочвання парушэнняў свабоды выравызнання і пазбаўлення ад абмежаванняў свабоды веравызнання ў краіне.

17 чэрвеня 2007 года больш як 500 пратэстанцкіх суполак па ўсёй краіне сабраліся ў цэрквах на набажэнствы і маліліся за змены ў законе аб рэлігіі, які яны лічаць дыскрымінацыйным у адносінах да пратэстанцкіх супольнасцяў. 22 красавіка хрысціянскія суполкі, у тым ліку пратэстанцкія і каталіцкія, а таксама некаторыя праваслаўныя святары і Беларуская хрысціянская дэмакратыя распачалі кампанію збору 50 000 подпісаў за адмену закона 2002 года аб веравызнанні і рэлігійных арганізацыях.  8 траўня Беларускі экзархат Рускай праваслаўнай царквы заклікаў вернікаў не ставіць свой подпіс пад зваротам і заявіў, што закон дапамагае падтрымліваць мір паміж рэлігійнымі супольнасцямі і стабільнасць у краіне. Удзельнікі кампаніі паведамілі, што па стане на 13 ліпеня 2007 года свае подпісы паставілі больш як 25 000 чалавек.

4 чэрвеня 2007 года незалежныя агенцтвы навінаў паведамілі, што каля 5 000 пратэстантаў сабраліся ў Мінску каля царквы "Міласэрнасць", каб маліцца за тых актывістаў, хто выступае за правы вернікаў і каго пераследуюць, і за свабоду веравызнання, у тым ліку за права маліцца ў прыватных дамах. Прысутныя ўхвалілі тэкст звароту, адрасаванага прэзідэнту Лукашэнку, у якім яны прасілі перагледзець закон 2002 года аб веравызнанні і спыніць арышты пастараў.

Частка 4. Палітыка ўрада ЗША

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам  ў межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека, але афіцыйныя асобы неаднаразова адхілялі прапановы прадстаўнікоў урада ЗША сустрэцца, каб абмеркаваць крокі, што ўспрымаюцца як парушэнні.

Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі сувязі з прадстаўнікамі рэлігійных груп, сустракаліся для абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання ў краіне з грамадзянамі ЗША рознага веравызнання, якія жывуць у Беларусі або наведваюць краіну. Супрацоўнікі амбасады бралі ўдзел у шэрагу мерапрыемстваў, што праводзіліся рознымі рэлігійнымі групамі, у тым ліку ў адкрыцці рэлігійных помнікаў. Амбасада дэманстравала падтрымку свабоды веравызнання праз наведванне судоў над прадстаўнікамі рэлігійных груп, што цярпелі ад пераследу. Урад Злучаных Штатаў выступаў з асуджэннем выпадкаў антысемітызму і рабіў захады, каб прадухіліць такія выпадкі, у тым ліку праз пастаянную праверку паведамленняў пра выпадкі апаганьвання яўрэйскіх мемарыялаў і могілак. Амбасада сачыла за працягам продажу антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры ў крамах і падчас імпрэзаў, звязаных з БПЦ, а

таксама праз дзяржаўную сетку распаўсюду друкаваных выданняў. Супрацоўнікі амбасады стала ўключалі ў праграму сваіх вандровак па краіне наведванне культавых месцаў.

Супрацоўнікі амбасады абмяркоўвалі пытанні веравызнання з прадстаўнікамі іншых замежных дыпламатычных місій і каардынавалі дзеянні, каб разам дэманстраваць падтрымку свабоды веразвызнання. Напрыклад, амбасадар Злучаных Штатаў разам з амбасадарамі Еўрапейскага Саюза наведалі царкву “Новае Жыццё” падчас супрацьстаяння паміж ёй і уладамі, калі сябры царквы праводзілі галадоўку на знак пратэсту супраць прымусовага продажу дзяржаве царкоўнай уласнасці.